# Комплекс залатых манет другой паловы XVI ст. з раскопак Заслаўскага замка

Раман КРЫЦУК



Член ГА «Беларускае нумізматычнае таварыства», Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, e-mail: Kola.Sonca@gmail.com



*Малюнак 1*



*Малюнак 2*

У 1983 г. у фонды Дзяржаўнага музея БССР (зараз – Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, далей – НГМ РБ) былі перададзены матэрыялы археалагічнай экспедыцыі Ю.А. Заяца (1951–2011) з раскопак 1980 г. замка ў горадзе Заслаўе Мінскай вобласці. Акрамя вялікай колькасці археалагічных прадметаў фонды музея папоўніліся трыма залатымі манетамі. Першасна інфармацыя пра манеты была апублікавана ў працы Ю.А. Заяца «Заславль в эпоху феодализма» [1, с. 25[1]], а таксама згадвалася ў энцыклапедычных [2; 3], навукова-папулярных [4, с. 165] выданнях і каталогах [5, с. 59].

Першая манета (КП 36044, *малюнак 1*[2]) – гэта дукат 1576 г. Карла II, эрцгерцага Аўстрыі (1564–1590). Ён адбіты ў герцагстве Карынцыя (ням. Kärnten, лац. Carantania) на манетным двары Клагенфурт (Klagenfurt). Вага манеты – 3,46 г, дыяметр – 21 мм, метал – золата 900°. На аверсе манеты змешчана выява ў анфас манарха ў даспехах у поўны рост. У правай руцэ – скіпетр, левая рука ляжыць на рукаяці мяча, замацаванага на поясе. Вакол выявы ў двайной абводцы змешчана легенда: «CAROLVS·DEI·G.ARCHI·DVX:». На рэверсе манеты ў цэнтры змешчаны іспанскі шчыт з выявай герба Карынцыі, уверсе шчыт, каранаваны герцагскай каронай. Па крузе ў двайной абводцы змешчана легенда: «AVSTRIÆ·ET·CARINTHIÆ·ZC·76».

Другая манета (КП 36045, *малюнак 2*) – султані (алтун) Мурада III, султана Асманскай імперыі (1574–1595)[3]. Яна адбіта на манетным двары Джанджа (Khánjah; Khánjá, суч. Гюмюшханэ ў Турцыі). Вага манеты – 3,4 г, дыяметр – 19 мм, метал – золата 900°. Асманскія залатыя манеты да пачатку XVII ст. біліся з так званай датай інтранізацыі манарха – калі ён узыходзіў на прастол. Адпаведна, на гэтай (і на наступнай) манеце змешчаны 982 год хіджры (1574–1575 гг. н. э.). На аверсе ў некалькі радкоў размешчана легенда: «Sultan Murad / bin Selim han / azze nasrühu duribe fi / Canca / 982 / sene», якая перакладаецца як: «Султан Мурад, сын Селіма хана, няхай праславіцца яго перамога. Адбіта

[1] *«...в раскопе X были найдены золотые монеты – 2 алтуна: Турция, Мурад III ибн Сулайман, 982 г. х. (1574–1575) и дукат: Каринтия, эрцгерцог Карл, монетный двор Клагенфурт, 1576. Быть может, эти монеты в качестве традиционной строительной жертвы были замурованы в фундаменте постройки».*

[2] *Фота манет – Марыя Латышава (Сцяпанава).*

[3] *Вялікую падзяку за дапамогу ў вызначэнні атрыбуцыі манет Асманскай імперыі выказваю к.г.н. старшаму супрацоўніку Адэскага археалагічнага музея НАН Украіны Дзмітрыю Міронавічу Янаву.*

ў Джанджы, 982 год». На рэверсе ў некалькі радкоў змешчана легенда: «Daribü'n-nadri / sahibü'l-izzi ve'n-nasri / fi'l-berri ve'l-bahri», якая перакладаецца як: «Чаканячы бліскуча, спадар славы і перамогі на зямлі і на моры» [6, s. 960, no. 12-CA-A2d].

Апошняя, трэцяя манета (КП 36046, *малюнак 3*) – гэта падробка пад залаты султані Мурада III. Арыгінал біўся на тэрыторыі Сірыі, на манетным двары Дзімішк (суч. Дамаск у Сірыі). Вага манеты ніжэй за эталонную норму – 2,85 г замест 3,43 г [7], дыяметр – 20 мм. У адрозненні ад большасці падробак залатых манет дадзены экзэмпляр пакрыты тоўстым слоем залатой фальгі ($900^{\circ}$), а не пазалотай. Манета мае пашкоджанні, якія дазваляюць зазірнуць пад пакрыццё. Незразумела, што за метал служыў асновай для падробкі, таму што на месцы пашкоджання ён адсутнічае. Па меркаванні Ю.А. Заяца, якому аказваў кансультацыйную дапамогу В.Н. Рабцэвіч, ядро манеты магло быць зроблена са свінцу [8, с. 17]. На аверсе ў некалькі радкоў змешчана легенда: «Sultan Murad şah / bin Selim han / azze nasrühu duribe / fi Dimişk / sene / 982», якая перакладаецца як: «Султан Мурад, сын Селіма хана, няхай праславіцца яго перамога. Адбіта ў Дзімішке, год 982». На рэверсе ў некалькі радкоў змешчана легенда: «Daribü'n-nadri / sahibü'l-izzi ve'n-nasri / fi'l-berri ve'l-bahri», якая перакладаецца як: «Чаканячы бліскуча, спадар славы і перамогі на зямлі і на моры» [6, s. 975, no. 12-DM-A2b].

## Археалагічны кантэкст комплексу

Манеты былі выяўлены на тэрыторыі раскопу № X (*малюнак 4*, раскоп абазначаны чырвоным колерам). Пляцоўка замка на працягу XIX–XX стст. неаднаразова нівеліравалася, акрамя таго, у міжваенны перыяд на ёй быў узведзены будынак Дома культуры [8, с. 17] (*малюнак 4*, контур будынка абазначаны чорным колерам; *малюнак 5*, Дучыц М.В. Царква ў Заслаўі. 1945. Кардон, алей. 45,5 х 35,5. ДУ ГКМЗ «Заслаўе»)[4]. Апошні знішчыў падмуркі вялікага будынка (палаца) канца XVI ст. – пачатку XVII ст., часткова знойдзенага ў раскопах № XV і XII. Выбраная з падмуркаў Дома культуры глеба, па меркаванні Ю. Заяца, была высыпана ў раёне раскопу № X [1, с. 25], стварыўшы верхні слой таўшчынёй ад 0,44 м да 1,1 м [8, с. 8]. Таксама трэба адзначыць той момант, што да правядзення засыпкі тэрыторыі раскопу № X там знаходзіўся стары драўляны барак. Адпаведна, менавіта ў гэтым верхнім слоі і былі выяўлены манеты. Дукат Карынцыі быў знойдзены ў 2-м пласце 3-га квадрата, прычым побач з ім былі выяўлены 2 капейкі СССР 1926 г. Абодва султані былі знойдзены ў 3-м пласце 2-га квадрата, разам з нямецкім лічыльным жэтонам «из мастерской Ганса Шультеса / Нюренберг, Германия, XVII в.» [8, с. 8[5]].



*Малюнак 4*



*Малюнак 5*



*Малюнак 3*

[4] *Аўтар выказвае падзяку за прадастаўленне дадзенага малюнка Гаранскай Т.Г.*

[5] *Згодна са справаздачай «Определения монет выполнены кандидатом исторических наук Рябцевичем В.Н.».*

Акрамя таго, у верхнім пласце быў знойдзены нямецкі штык-нож часоў Першай сусветнай вайны, 2 капейкі СССР 1924 г., ключ XV–XVI стст. і фрагменты кафлі XVI–XVII стст.

Ю. Заяц у сваёй працы па Заслаўі выказаў здагадку, што дадзеныя манеты маглі быць закладзены ў якасці ахвяры падчас пабудовы палаца. Практыка закладання манет пры пабудове прыватных жылых будынкаў раней была даволі распаўсюджана на тэрыторыі Беларусі, а часам трапляецца дагэтуль. Але наколькі дадзеная практыка распаўсюджвалася на больш грандыёзныя пабудовы, такія як палацы і замкі? В.Н. Рабцэвіч зафіксаваў адзін такі выпадак: *«В 1951 г. при сносе руин замка в гор. Быхове Могилёвской области в основании одного из его углов найдена монета 1562 г.» [9, с. 60].*

На жаль, у працы не згадваецца падрабязна намінал і эмітэнт манеты (магчыма – гэта паўгрош ВКЛ), а таксама адсутнічае спасылка на крыніцу інфармацыі і больш падрабязныя абставіны знаходкі. Найбольш верагодна, што дадзеныя манеты не з'яўляюцца рытуальнай ахвярай, а адносяцца да часткі грашовага комплексу, выпадкова страчанага ці захаванага на тэрыторыі замка. Прычым гэты скарб быў парушаны і раскіданы на вялікай плошчы яшчэ падчас міжваенных земляных прац, на што ўказваюць знойдзеныя побач манеты СССР. Верагодней за ўсе, падчас археалагічных даследаванняў была знойдзена толькі частка скарбу, што ўскладняе яго атрыбуцыю і датаванне.

### Час захавання комплексу і аналогіі

Гісторыя Заслаўя і Заслаўскага замка апісана ў працах Ю. Заяца, які разглядаў яе па большасці з пункту гледжання археолага, абапіраючыся толькі на адзінкавыя пісьмовыя крыніцы (большасць апублікаваны ў археаграфічных выданнях XIX–XX стст.). Таму ў яго працы амаль не адлюстраваны вайсковыя канфлікты, якія закраналі замак (за выключэннем вайны 1654–1667 гг.). Знойдзеныя манеты датуюцца перыядам 1574–1595 гг., але з-за таго, што перад намі толькі частка скарбу, яго храналагічныя межы захавання шырокія – ад 1595 г. да другой паловы XVII ст.

Акрамя Заслаўя, султані Асманскай імперыі на тэрыторыі Беларусі прысутнічаюць у складзе Засоеўскага скарбу – адна манета, адбітая пры султане Мухамедзе III (1595–1603 гг.) [10]. У Магілёўскім залатым скарбе 1936 г. [11] асманскія манеты адсутнічалі. Крыху лепшая сітуацыя з аналогіямі ў нашых суседзяў у Польшчы і на Украіне. На тэрыторыі Польшчы зафіксаваны цэлы шэраг скарбаў, захаваных у перыяд 1598–1641 гг., у складзе якіх былі залатыя манеты Порты [12[6]]. Але большасць гэтых скарбаў, што былі знойдзены ў XIX ст., не захаваліся да нашых часоў, а манеты былі атрыбутаваны вельмі ўмоўна. На тэрыторыі Украіны такіх знаходак крыху менш, але яны лепш апісаны [13[7]]. Таксама менавіта там зафіксавана знаходка дуката Карынцыі 1551 г. [13, s. 65, № 227].

Такім чынам, у фондах НГМ РБ захоўваецца цікавы грашовы комплекс апошняй чвэрці XVI ст. – першай паловы XVII ст. Па сваім складзе ён не характэрны для грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі тых часоў і мае мала аналагаў. Верагодна, дадзеныя манеты з'яўляюцца часткай скарбу, рэшта якога дагэтуль знаходзіцца на тэрыторыі замка.

***Бібліяграфічны спіс:***

1. *Заяц, Ю.А. Заславль в эпоху феодализма / Ю.А. Заяц. – Минск: Наука и техника, 1995. – 207 с.*

2. *Заяц, Ю.А. Заслаўскі замак / Ю.А. Заяц // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Бел. Энцыкл.; рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. – Мінск.: БелЭн, 1993. – С. 267.*

3. *Заяц, Ю.А. Заслаўскі замак / Ю. А. Заяц // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск.: БелЭн, 2005. – Т. 1. – С. 649.*

4. *Археологическое наследие Беларуси / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории; сост., авт. вступ. ст. О.Н. Левко; науч. ред. А.А. Коваленя, О.Н. Левко. – Минск: Беларус. навука, 2012. – 192 с.*

5. *Каталог выставы «Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля» / Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь; скл. Р.І. Крыцук, В.М. Сідаровіч, к.м. Л.І. Талкачова; рэц. І.Н. Колабава, М.А. Плавінскі. – Мінск: Кнігазбор, 2018. – 106 с.*

6. *Damali, A. Osmanli sikkeleri tarihi. History of Ottoman coins / A. Damali. – Istanbul, 2011. – Cilt 3.*

7. *Алтун / Словарь нумизмата / Сост. Х. Фенглер, Г. Гирроу, В. Унгер; пер. с нем. М.Г. Арсеньевой; отв. ред. В.М. Потин. – 2-е изд., перераб. и доп. – М.: Радио и связь, 1993. – С. 12.*

8. *Заяц, Ю.А. Отчет о полевых исследованиях 1980 г. Заславской группы отряда «Новый экскурс: маршрут вокруг Минска» / Ю.А. Заяц // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 690. – 38 с., 5 с. колл. оп., 78 рис.*

9. *Рябцевич, В.Н. Нумизматика Беларуси / В.Н. Рябцевич. – Минск: Полымя, 1995. – 687 с.*

10. *Рабцэвіч, В.Н. Засоеўскі манетны скарб / В.Н. Рабцэвіч // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Бел. Энцыкл.; рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.] – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 268–269.*

11. *Рабцэвіч, В.Н. Магілёўскія скарбы / В.Н. Рабцэвіч // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Бел. Энцыкл.; рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 387.*

*[6] S. 67 № 193 (złote «arabskie» mon.); S. 81–82 № 262 (mon. złota); S. 94–95 № 312 (5 złotych mon. wielkości dukata z 1 poł. XVII w.); S. 115 № 393 (złote mon. (3); S. 126 № 437 (złote mon. «arabskie» (z tamgą) (2); S. 132 № 453 (złota mon. «z arabskim napisem»); S. 169–170 № 604 (złota mon. «arabska»); S. 174 № 619 (nieokr. mon. złota).*

*[7] S. 84 № 318 (monety złote – 3 egz.); S. 105 № 431 (10 tureckich); S. 108 № 444 (Turcja: Amurat III, 982 g. h.); S. 144 № 603 (Turcija: monety z lat 1520–1604 Sulejmana II – 8, Selima II – 1, Murada III – 10, Muhammeda III – 3, Achmeda I – 3).*

*12. Mikołajczyk, A. Skarby monet z lat 1500–1649 na obszarze PRL. Inwentarz / A. Mikołajczyk, M. Męclewska. – Warszawa: PTAiN, 1983. – 189 s.*

*13. Kotlar, M. Znaleziska monet z XIV–XVII w. na obszarze Ukraińskiej SRR. Materiały / M. Kotlar. – Wrocław, Warszawa, Kraków, Gdańsk: Ossolineum, 1975. – 320 s.*

# A Set of Gold Coins of the Second Half of the XVI Century from the Excavations of Zaslavl Castle

**Raman KRYTSUK,** *Member of the NGO "Belarusian Numismatic Society", Republic of Belarus, Minsk, e-mail: Kola.Sonca@gmail.com.*

**Abstract.** *In 1983, the materials of the archeological expedition of Y.A. Zayats (1951–2011) from the excavations (1980) of the castle in Zaslavl were transferred to the State Museum of BSSR. In addition to a large number of archeological objects, the museum's funds were replenished with three gold coins, the description of which is given in the article. The author concludes that the funds of the National Historical Museum of the Republic of Belarus contain an interesting monetary complex of the last quarter of the XVI century - the first half of the XVII century. The complex in its composition is not typical for the money circulation in Belarus at that time and has few analogues. Probably, these coins are part of the hoard, the rest of which is still in the territory of the castle.*